*А. В. Гаўрыкаў*
Інстытут сацыялогіі Нацыянальный акадэміі навук Беларусі, Мінск

*V. Gavrikov*
Institute of Sociology of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk

**УДК 32.019.51(476)**

# ТЭНДЭНЦЫІ ПРАВАВОЙ ІНСТЫТУЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

# TRENDS IN THE LEGAL INSTITUTIONALIZATION OF POLITICAL PARTIES IN THE REPUBLIC OF BELARUS

*Палітычныя партыі з'яўляюцца абавязковым інструментам ажыццяўлення прадстаўнічай дэмакратыі, з дапамогай якога грамадзяне ўдзельнічаюць у працэсе кіравання грамадствам. Ужо даўно ўстаноўлена роля і значэнне партый, у той час як іх асаблівае прававое рэгуляванне з'явілася адносна нядаўна. Прававыя змены ў інстытуцыяналізацыі палітычных партый выступаюць галоўным фактам палітыка-юрыдычнай дзейнасці дадзенага сацыяльна-палітычнага інстытута. Зараз у Беларусі адбываецца грамадскае абмеркаванне законапраекта па пытаннях дзейнасці палітычных партый. На грамадскае абмеркаванне вынесены праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змене законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў». Неабходна разгледзіць тэндэнцыі прававой інстытуцыяналізацыі палітычных партый Рэспублікі Беларусь. З дапамогай інстытуцыйнага аналізу аўтар разглядае прававыя аспекты станаўлення палітычных партый у параўнальна-прававым аспекце.*

*Ключавыя словы: палітычная партыя; палітычны рэжым; дзяржаўнае субсідзіраванне; Закон аб палітычных партыях; прынцып рэгістрацыі партыі.*

*Political parties are an indispensable tool for the implementation of representative democracy, through which citizens participate in the process of managing society. The role and importance of parties has long been established at a time when their special legal regulation is relatively recent. Legal changes in the institutionalization of political parties is the main fact of the political and legal activity of this socio-political institution. Now in Belarus there is a public discussion of the bill on the activities of political parties. The draft Law of the Republic of Belarus "On changing laws on the activities of political parties and other public associations" was submitted for public discussion. Most attention was paid to the following issues: reorganization of public associations into political parties, reduction in the number of founders and the introduction of state subsidies for the activities of political parties. It is necessary to consider the trends in the legal institutionalization of political parties of the Republic of Belarus. Using institutional analysis, the author examines the legal aspects of the formation of political parties in the comparative legal aspect.*

*Keywords: political party; political regime; state subsidies; Law on political parties; principle of party registration.*

Развіццё партыйнай сістэмы, палітычнай канкурэнцыі з’яўляецца неабходным атрыбутам прававой і дэмакратычнай дзяржавы. Практычна агульнапрынятым з’яўляецца меркаванне, што гэта магчыма толькі пры наяўнасці палітычнай волі, як з боку ўлады, саміх палітычных партый, так і насельніцтва. Унясенне змен у Закон аб палітычных партыях – важны і вялікі крок на шляху прававога развіцця шматпартыйнасці.

Пры Мінюсце пачала функцыянаваць рабочая група па змене закона «Аб палітычных партыях» [1]. «Праэкт закона накіраваны на ўдасканаленне падыходаў да працэсу стварэння і дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў, палітычных партый, іх арганізацыйных структур, выкарыстанню сучасных тэхналогій пры правядзенні імі мерапрыемстваў, узаемадзеяння з рэгіструючымі органамі, спрашчэнні атрымання юрыдычнага адрасу, павышэнню празрыстасці іх дзейнасці» [2].

Змены ў праект «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб’яднанняў» абмяркоўваліся з 12 ліпеня па 2 жніўня 2019 г., пры гэтым кожны мог пакінуць сваё меркаванне на Прававым форуме Беларусі [3].

Нягледзячы на перыферыйнае становішча ў палітычнай сістэме краіны палітычных партый, змены ў прававое рэгуляванне дзейнасці дадзенага інстытута ўносяцца даволі часта. Згодна з гэтым новыя змены і папраўкі ў Закон аб палітычных партыях маюць важнае прэвентыўнае значэнне як галоўны імператыў далейшага развіцця палітыкі прадстаўнічай дэмакратыі ў краіне. Апазіцыйнымі партыямі і рухамі вылучаны свой праект рэформаў:

• увядзенне дзяржаўнага субсідзіравання;

• змяншэнне колькасці заснавальнікаў партыі да 500 чалавек;

• змены ў пункце рэарганізацыі грамадскіх аб’яднанняў у палітычныя партыі [4].

Палітычная партыя – гэта адзін з галоўных інстытутаў прадстаўнічай дэмакратыі, які аб’ядноўвае інтарэсы розных катэгорый грамадзян. Роля палітычных партый як прадстаўнічага інстытута адзначаецца ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са зменамі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996 г. і 17 кастрычніка 2004 г.).

У адпаведнасці з артыкулам 5 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь «палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб’яднанні, дзейнічаючы ў рамках Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, садзейнічаюць выяўленню і выказванню палітычнай волі грамадзян, удзельнічаюць у выбарах» [5, с. 56]. Як заўважыў нямецкі даследчык Х. Трынель, заходнія дэмакратыі прайшлі чатыры этапы адносін да партый з боку дзяржавы:

• барацьба з партыямі;
• ігнараванне партый;
• легалізацыя партый;
• інкарпараванне ў канстытуцыйную сістэму.

У цяперашні час, з улікам гістарычнага вопыту, дэмакратыя ўжо не можа разглядацца асобна ад палітычных партый. Вопыт паказвае, што менавіта палітычныя партыі часта аказвалі значны ўплыў на правядзенне канстытуцыйных рэформаў, прыняцце рашэнняў, накіраваных на пераўтварэнне ў эканамічнае і палітычнае жыццё краіны.

Пасля правядзення акцыі прамога дзеяння і 200-тысячнага мітынгу ў Маскве за адмену артыкула 6 Канстытуцыі Урад вымушаны быў пайсці на палітычныя саступкі і 14 сакавіка 1990 г. быў прыняты Закон аб заснаванні пасады Прэзідэнта СССР і ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю СССР [6]. Важным момантам стала пытанне, як павінна была адбывацца рэгістрацыя новага палітычнага інстытута. У Канстытуцыйным праве розных краін існуюць спосабы набыцця палітычнымі партыямі легальнага статусу. Расійскім даследчыкам доктарам юрыдычных навук, прафесарам Ю. А. Юдзіным вылучаюцца тры галоўныя парадкі набыцця палітычнымі партыямі легальнага статусу: явачны, дазвольны і явачна-рэгістрацыйны (заяўны) [7, с. 38].

Для явачнага парадку характэрна свабоднае стварэнне партый. Пры гэтым не патрабуецца атрымання якога-небудзь дазволу дзяржаўных органаў улады. Явачны парадак уяўляе сабой аднабаковае волевыяўленне грамадзян без якіх-небудзь дадатковых прававых і арганізацыйных працэдур. Такі парадак дзейнічае пераважна ў краінах са слабой прававой інстытуцыяналізацыяй партый, якія не маюць спецыяльных законаў аб іх (напрыклад, у Вялікабрытаніі, Бельгіі, Грэцыі, Даніі, Нідэрландах, Нарвегіі, Францыі, Швецыі, Індыі, Канадзе, Новай Зеландыі, ЗША і інш.). Аднак для таго каб атрымаць правы юрыдычнай асобы, партыі павінны прайсці працэдуру рэгістрацыі, якая прадугледжваецца грамадзянска-прававымі нормамі. Акрамя таго, у шэрагу выпадкаў зарэгістраваныя партыі карыстаюцца шэрагам перavaг. Напрыклад, у Індыі яны маюць права выкарыстоўваць на ўсіх выбарах адзін і той жа знак або сцяг. Гэта мае вялікае значэнне ў краіне, дзе многія выбаршчыкі непісьменныя і знакі для іх – важны спосаб адрозніць паміж сабой партыі, якія ўдзельнічаюць у выбарах [8, с. 37].

Распарадчы (дазвольны) парадак – сутнасць гэтага парадку заключаецца ў тым, што для правядзення ўстаноўчага з’езда партыі і яе далейшай дзейнасці патрабуецца папярэдні дазвол кампетэнтнага дзяржаўнага органа.

Явачна-рэгістрацыйны парадак прадугледжвае стварэнне партый без папярэдняга дазволу, аднак з умовай іх рэгістрацыі пры выкананні пэўных патрабаванняў, устаноўленых законам. З моманту рэгістрацыі палітычныя партыі набываюць статус юрыдычнай асобы, і адмова ў ёй магчыма толькі ў строга абмежаваных выпадках, прама пералічаных у законе. Такі парадак рэгістрацыі прысутнічае ў большасці постсавецкіх дзяржаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы [8, с. 38].

Беларусь выбрала явачна-рэгістрацыйны парадак рэгістрацыі палітычных партый. Першымі актамі, якія рэгламентуюць стварэнне і дзейнасць палітычных партый у Рэспубліцы Беларусь, сталі Пастанова Вярхоўнага Савета БССР ад 28 ліпеня 1990 г. № 222-XII «Аб рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў у Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы», Пастанова Савета Міністраў БССР ад 3 кастрычніка 1990 г. № 255 «Аб зацвярджэнні Часовага палажэння аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў грамадзян у Беларускай ССР».

Акты ўсталёўвалі членства ў палітычных партыях не менш за 100 заснавальнікаў і выплаты дзяржаўных пошлін у памеры 10 мінімальных акладаў, што з'яўлялася невялікім бар'ерам для рэгістрацый палітычных партый у Беларусі (1990–1994).

Галоўнай падзеяй для станаўлення палітычных партый у Рэспубліцы Беларусь стала прыняцце 5 кастрычніка 1994 г. Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 12-га склікання Закона аб палітычных партыях. Ён павінен быў упарадкаваць, а таксама рэгламентаваць дзейнасць палітычных партый у палітычным полі краіны. У Законе ўпершыню даецца дакладнае вызначэнне паняцця «палітычная партыя», разглядаюцца правы палітычных партый, фінансаванне партый і кантроль над іх дзейнасцю. Закон прадугледжваў павелічэнне мінімальнай колькасці членаў партыі са 100 да 500 чалавек [9].

У 1995 г. для ўпарадкавання дзейнасці палітычных партый Кабінетам Міністраў Рэспублікі Беларусь было прынята рашэнне аб палітычнай перарэгістрацыі партый (пастанова ад 3 лютага 1995 г. № 76 «Аб палітычных партыях»). Перарэгістрацыю прайшлі каля 58 % арганізацый і палітычных партый [10, с. 48].

Для ўрэгулявання палітычнай дзейнасці прэзідэнтам быў прыняты Дэкрэт ад 13 ліпеня 1999 г. № 26 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Дэкрэт ад 26 студзеня 1999 г. № 2». Дэкрэт таксама павялічыў мінімальную колькасць членаў партыі, неабходную для ажыццяўлення яе рэгістрацыі: з 500 да 1000 членаў [11]. Пасля адпаведных нарматыўна-прававых змяненняў была праведзена перарэгістрацыя палітычных партый. У выніку з 27 рэгістрацыю па розных прычынах змаглі прайсці 17. На сённяшні дзень Міністэрствам юстыцыі зарэгістравана 15 палітычных партый. Такім чынам, прававыя змены і змены ў Законе аб палітычных партыях могуць стаць новым імпульсам развіцця палітычных партый у краіне. Гэтыя змены паспрыялі выхаду палітычных партый з сістэмнага крызісу і не сталі спрыяць фактарам з'яўлення партый маргіналаў і тых, хто існуе толькі на паперы.

**Фінансаванне палітычных партый.** Прававыя нормы, якія рэгулююць фінансаванне палітычных партый, уяўляюць сабой важны канстытуцыйна-прававы інстытут, бо аказваюць уплыў не толькі на асобныя партыі, але

і на партыйную сістэму краіны ў цэлым. Кантроль за фінансавай дзейнасцю палітычных партый, крыніцамі іх даходаў, памерамі атрыманых сродкаў і выплатай падаткаў ажыццяўляюць дзяржаўныя падатковыя органы. Згодна з патрабаваннем арт. 31. Закона аб палітычных партыях, апошнія абавязаны штогод не пазней 1 сакавіка прадстаўляць падатковым органам адпаведную справаздачу аб сваёй фінансавай дзейнасці з указаннем даходнай і расходнай частак бюджэту.

Улічваючы замежны вопыт, было б мэтазгодным замацаваць абавязак партый публікаваць такія справаздачы ў сродках масавай інфармацыі для забеспячэння «празрыстасці» сваёй фінансавай дзейнасці. Умоўна можна вылучыць тры групы паступленняў грашовых сродкаў на патрэбы партыі:

- уласныя сродкі палітычных партый;
- прыватнае фінансаванне;
- дзяржаўнае фінансаванне.

Суадносіны гэтых груп і рэгламентацыя крыніц фінансавання ў розных краінах істотна адрозніваюцца. У 2001 г. быў падпісаны Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 8 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні парадку атрымання і выкарыстання замежнай бязвыплатнай дапамогі», у адпаведнасці з якім дзяржаве былі перададзены паўнамоцтвы па кантролю атрымання і выкарыстання палітычнымі партыямі грошай з-за мяжы [12].

У Беларусі маецца прамая забарона займацца гаспадарчай і іншай камерцыйнай дзейнасцю, за выключэннем продажу грамадска-палітычнай літаратуры, іншых агітацыйных матэрыялаў, вырабаў з уласнымі знакамі, правядзення фестываляў, святаў, выставак, лекцый, іншых грамадска-палітычных мерапрыемстваў.

Да ўласных сродках палітычных партый адносяцца:

- уступныя і членскія ўзносы;
- прыбытак ад партыйных мерапрыемстваў (правядзенне выстаў, лекцый, фестываляў і г. д.);
- даходы ад дазволенай гаспадарчай дзейнасці;
- партыйная рухомая і нерухомая маёмасць.

Прыватнае фінансаванне палітычных партый у большасці краін з’яўляецца пераважным. Асноўнай крыніцай такога фінансавання служаць добраахвотныя ахвяраванні фізічных і юрыдычных асоб (грашовыя ўзносы, падарункі і г. д.). Ахвяраванні прыватных юрыдычных асоб складаюць значную частку партыйных бюджэтаў. Асабліва гэта прыкметна ў перыяд правядзення выбарчых кампаній. Пры гэтым ахвяраванні прыватных ці юрыдычных асоб нярэдка выкарыстоўваюцца як сродак падпарадкавання палітычных партый уласным інтарэсам асобных груп фінансавага ці прамысловага капіталу.

28 лістапада 2003 г. быў прыняты Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 24 «Аб атрыманні і выкарыстанні замежнай бязвыплатнай дапамогі»,

які дапаўняў і павялічваў магчымасці дзяржаўнага кантролю за атрыманнем замежнай матэрыяльнай дапамогі партыямі. Такая прававая норма ў шэрагу краін абумоўлена жаданнем не дапусціць магчымага ўплыву на дзейнасць палітычнай партыі, так як асноўная дзейнасць такіх арганізацый звязаная з уплывам на палітыку, на дзейнасць дзяржавы, і таму фінансаванне палітычных партый і іншых арганізацый замежнымі арганізацыямі і асобамі, замежнымі дзяржавамі можа ўшчамляць суверэнітэт краіны [13].

У 2011 г. некамерцыйным арганізацыям было забаронена трымаць рахункі ў замежных банках, займацца адукацыйнай дзейнасцю. Сёння дзяржаўнае субсідзіраванне ў Рэспубліцы Беларусь забаронена. Аднак яго ўвядзенне можа стаць адным з асноўных новаўвядзенняў у Закон аб палітычных партыях.

Прававой асновай дзяржаўнага фінансавання з'яўляецца прызнанне палітычных партый найважнейшым інструментам грамадзянскай супольнасці, які мае вялікую ролю ў арганізацыі і ажыццяўленні дзяржаўнай улады. Існуюць два віды дзяржаўнага субсідзіравання палітычных партый:

- агульнае фінансаванне;
- прадастаўленне дзяржаўных субсідый на бягучую дзейнасць палітычных партый (утрыманне партыйнага апарату, правядзенне з'ездаў, канферэнцый, арэнда памяшканняў, набыццё абсталявання).

Спецыяльнае фінансаванне – субсідзіравання пэўных відаў дзейнасці (правядзенне выбарчых кампаній, дзейнасць парламенцкіх фракцый). Вылучаецца прамое і ўскоснае фінансаванне.

Пад ускосным фінансаваннем разумеюцца бясплатныя выступленні партыйных функцыянераў у дзяржаўных сродках масавай інфармацыі, бясплатнае прадастаўленне партыям спецыяльных памяшканняў, увядзенне падатковых ільгот або поўнае вызваленне ад падаткаў партыйнай маёмасці. Прамое фінансаванне дзяржавай палітычных партый прадугледжвае перадачу ў распараджэнне партый грашовых сродкаў са спецыяльнага фонду, створанага на аснове дзяржаўных асігнаванняў.

Увядзенне дзяржаўнага субсідзіравання палітычных партый ў Рэспубліцы Беларусь – пытанне не адназначнае і далікатнае адносна палітыка-прававой традыцыі ў краіне. Параўнальны аналіз дзяржаўнага субсідзіравання ў замежных краінах паказвае, што на дадзены момант усе мадэлі дзяржаўнага фінансавання палітычных партый знаходзяцца ў дынаміцы. Для стымулявання дзейнасці палітычных партый магчымай мерай магла б быць мадэль ¼, пры якой партыі, якія прынялі ўдзел у выбарчай кампаніі (пры прад'яўленні расходных каштарысаў), атрымлівалі б кампенсацыю расходных сродкаў у перыяд выбарчай кампаніі. Дадзеная мера можа стаць адным з пунктаў актывізацыі дзейнасці ўсіх палітычных партый у перыяд выбарчых кампаній.

**Памяншэнне колькасці заснавальнікаў партыі да 500 чалавек.** Адной з прапаноў апазіцыйных палітычных партый з'яўляецца зніжэнне

рэгістрацыйнага парога ў два разы: з 1000 да 500 чалавек. Аналагічныя рэформы былі праведзеныя ў Расійскай Федэрацыі (з 50 тыс. да 500 чалавек) і ва Украіне, дзе колькасць заснавальнікаў складае 10 тыс. Можна пагадзіцца з меркаваннем міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь А. Сліжэўскага, што колькасць заснавальнікаў у 1000 чалавек, з'яўляецца аптымальным для нашай краіны: «Основная проблема, насколько я помню, это необходимость собрать минимальное количество учредителей партии. Необходимая минимальная численность – 1000 учредителей. Наверное, не ошибусь, что во всех случаях вопросы возникали к количеству и составу учредителей. Постоянно в этих списках были мертвые души, либо реальные граждане, которые понятия не имели, что являются учредителями этой партии» [14].

У Беларусі каля 7 млн чалавек валодаюць выбарчым правам і з'яўляюцца дзеяздольным. Пры ўстойлівай цікавасці да палітыкі і палітычных партый магчыма сабраць 1000 сапраўдных подпісаў. 15 палітычных партый, якія дзейнічаюць у краіне, прапануюць дастатковыя магчымасці для рэалізацыі ідэй актыўных грамадзян на палітычным полі.

Новым палітычным структурам складана знайсці тых, хто б іх падтрымаў. «Создание новых политических структур представляет сложность в поиске тех, кто это направление поддержал бы. Активные граждане, чаще всего, уже состоят в какой-то партии или политической организации, либо просто не хотят быть составляющей каких-то политических партий» [14].

**Змены ў пункце рэарганізацыі грамадскіх аб'яднанняў у палітычныя партыі.** У беларускай палітыцы ў якасці арганізацыі, на аснове якой магла б паўстаць палітычная партыя, часта разглядаюцца аб'яднанні: рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», кампанія «Гавары Праўду» і незарэгістраваная беларуская палітычная партыя БХД.

Як заўважыла беларускі палітолаг Т. Шэндзік, «несмотря на то, что в реальной жизни нашей страны уже происходили трансформации общественно-политических организаций в политическую партию, этот процесс имеет ряд юридических факторов». Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб палітычных партыях», пры пераўтварэнні грамадскага аб'яднання ў палітычную партыю павінен змяняцца прынцып яе пабудовы арганізацыйнай структуры. Падраздзяленні грамадскага аб'яднання, створаныя на прадпрыемствах і ва ўстановах, павінны будуць станавіцца на ўлік у арганізацыях, сфарміраваных па тэрытарыяльным прынцыпе [15, с. 80].

Кампанія «Гавары праўду» плануе стварыць партыю так званага «новага тыпу», якая будзе апазіцыйнай па сутнасці, але будзе адрозніваецца ад існуючых апазіцыйных партый. Кіраўнікі кампаніі вырашылі стварыць партыю ў 2017 г. Яны выдзяляюць на гэтую справу 1,5–2 гады, і рэформы існуючага заканадаўства даюць ім магчымасць разлічваць на больш хуткую рэгістрацыю (кампанію змаглі зарэгістраваць толькі з пятага разу). Як

заўважыў адзін з кіраўнікоў кампаніі А. Дзмітрыеў у 2018 г., «пока в "Говори правду" нет тысячи людей, необходимых для создания партии. Но когда на форуме 12 ноября активисты проголосуют за создание партии, это "будет планом, в том числе и по привлечению новых людей"» [16].

БХД не можа зарэгістравацца як партыя аж з 2005 г., што афіцыйна абумоўлена неадпаведнасцю дакументаў, якія яна падае ў Мінюст, і заканадаўству, якое дзейнічае.

Такім чынам, заканадаўства 1990-х гг. было, несумненна, даволі ліберальным: колькасць заснавальнікаў была нізкай, неўрэгуляваныя ў поўнай ступені фінансаванне, дзейнасць партыі як сацыяльна-палітычнага інстытута, каб атрымаць правы юрыдычнай асобы, існавалі мінімальныя патрабаванні. Быў замацаваны явачна-рэгістрацыйны прынцып. Прыняцце Канстытуцыі і Закона аб палітычных партыях у 1994 г. стала важным этапам у рэгуляванні дзейнасці партый як некамерцыйных арганізацый і сацыяльна-палітычнага інстытута. Гэта гарантавала моцную пазіцыю дзяржавы і яе органаў у адносінах да палітычных партый. Змены ў заканадаўстве рэгулявалі адносіны паміж дзяржавай, палітычнымі партыямі і насельніцтвам. Прапанаваныя праекты рэформаў з'яўляюцца важным крокам для пабудовы шматпартыйнасці. Аднак зніжэнне рэгістрацыйнага парога з 1000 да 800, а тым больш да 500 заснавальнікаў, на наш погляд, з'яўляецца заўчасным, фінансаванне палітычных партый рацыянальна будзе па расходных каштарысах, а пераўтварэнне РОА «Белая Русь», кампаніі «Гавары праўду» і БХД у партыю мае шмат юрыдычных фактаў, якія не спрыяюць іх пераўтварэнню ў партыю.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Правовой форум Беларуси. Обсуждение проектов НПА. Проект Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам деятельности политических партий и других общественных объединений» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://forumpravo.by/forums/npa.aspx?forum=15&topic=13545. – Дата доступа: 11.07.2019.

2. Обоснование необходимости принятия Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам деятельности политических партий и других общественных объединений» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://forumpravo.by/files/Obosnovanie_proekt_Zakon_izm_o_politicheskih_partiyah.pdf. – Дата доступа: 11.07.2019.

3. Минюст предлагает упростить регистрацию партий и правила их работы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://reform.by/minjust-predlagaet-uprostit-registraciju-partij-i-pravila-ih-raboty/. – Дата доступа 18.07.2019.

4. Закон о партиях будут менять. Оппозиция хочет получать деньги из бюджета. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://news.tut.by/economics/639759.html. – Дата доступа: 12.07.2019.

5. Канстытуцыя нашай дзяржавы (1919, 1927, 1937 г., 1978 г., 1994). Афіцыйны тэкст. – Мінск: Маст. літ., 2011. – 293 с.

6. Закон СССР от 14 марта 1990 г. № 1360-1 «Об учреждении поста Президента и внесении, и дополнении в Конституцию (Основной Закон) СССР // Ведомости СНД и ВС СССР. 1990. № 12. Ст. 189 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.constitution20.ru/ckeditor_assets/attachments/276/1990_03_14_zakon_o_prezidente.pdf. – Дата доступа: 14.07.2019.

7. *Юдин, Ю. А.* Политические партии и право в современном государстве / Ю. А. Юдин. – М.: Форум: ИНФРА-М, 1998. – 285 с. (Б-ка сравнительного права).

8. Политические партии: Беларусь и современный мир / М. Ф. Чудаков [и др.]. – Минск: Тесей, 2002. – 368 с.

9. О политических партиях: Закон Респ. Беларусь, 5 окт. 1994 г., № 3266-XII: В ред. Законов Респ. Беларусь от 29.11.1999 г., от 13.12.1999 г., от 22.06.2001 г., от 26.06.2003 г., от 19.07.2005 г. // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2006. – Дата доступа: 15.07.2019.

10. *Гросс, Е. П.* Институционализация общественных обьединений Республики Беларусь / Е. П. Гросс // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Се. гуманітар. навук. – 2014. – С. 47–52.

11. О некоторых мерах по упорядочению деятельности политических партий, профессиональных союзов, иных общественных объединений: Декрет Президента Респ. Беларусь, 26 янв. 1999 г., № 2 [Электронный ресурс] // Нац. правовой Интернет-портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://www.etalonline.by/Default.aspx?type=text®num=PD9900002#load_text_none_1_1. – Дата доступа: 15.07.2019.

12. Декрет Президента Республики Беларусь от 12 марта 2001 г. № 8 «О некоторых мерах по совершенствованию порядка получения и использования иностранной безвозмездной помощи» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://pravo.levonevsky.org/bazaby/org459/sbor4/text3729.htm. – Дата доступа: 15.07.2019.

13. Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 лістапада 2003 г. № 24 «Аб атрыманні і выкарыстанні замежнай бязвыплатнай дапамогі».

14. Министр юстиции рассказал, почему не регистрируют новые политические партии [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://reform.by/ministr-justicii-rasskazal-pochemu-ne-registrirujut-novye-politicheskie-partii/. – Дата доступа: 15.07.2019.

15. *Шендик, Т. А.* «Белая Русь»: путь к партии? К вопросу о создании политической партии на базе общественно-политической организации / Т. А. Шендик // Беларус. думка. – 2017. – С. 79–84.

16. «Говори правду» может стать партией [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://news.tut.by/politics/517872.html. – Дата доступа 21.07.2019.

**(Дата падачы: 10.02.2020 г.)**